АД ІДЭІ ДА ІНАВАЦЫЙНАГА ПРАДУКТУ
Гутарка з начальнікам Галоўнага ўпраўлення навукі Віталём КУТАВІЧУСАМ
Стар. 2–3

НА СКРЫЖАВАННІ ЎСІХ ХІМІЙ
Пра кафедру радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій
Стар. 4–5

ІДЭАЛЬНЫ ВЫКЛАДЧЫК
Размова з загадчыцай кафедры міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права Аленай БАБКІНАЙ
Стар. 6

ЗААЛОГІЯ І КАНСТЫТУЦЫЙНАЕ ПРАВА
Чым займаюцца найлепшыя навуковыя гурткі БДУ?
Стар. 7

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

7 снежня 2018 года, № 17 (2205)

Дыплом «Ганаровы прафесар БДУ» ўручыў 16 лістапада рэктар **Андрэй Кароль** старшыні Палаты прадстаўнікоў Егіпта **Алі Абдэлю Аль Саеду Ахмеду.** Урачыстая цырымонія адбылася ў БДУ ў рамках афіцыйнага візіту ў Беларусь парламенцкай дэлегацыі Егіпта. У мерапрыемстве прынялі ўдзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Арабскай Рэспублікі Егіпет у Расіі і Беларусі па сумяшчальніцтве **Іхаб Ахмед Талаат Наср,** Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Арабскай Рэспубліцы Егіпет **Сяргей Рачкоў,** член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і намеснік кіраўніка працоўнай групы Нацыянальнага сходу нашай краіны па супрацоўніцтве з Парламентам Егіпта **Міхаіл Мілаванаў.**

Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

Егіпецкі палітык Алі Абдэль Аль Саед Ахмед стаў ганаровым прафесарам БДУ

Званне «Ганаровы прафесар БДУ» Алі Абдэль Аль Саед Ахмед ганараваны за вялікі асабісты ўнёсак у развіццё прававой навукі і ўмацаванне сяброўскіх адносін і супрацоўніцтва паміж Егіптам і Беларуссю.

У сваім выступленні перад членамі Савета БДУ, выкладчыкамі і студэнтамі высокапастаўлены госць прадставіў агульную карціну грамадска-палітычнай сітуацыі ў сваёй краіне. Алі Абдэль Аль Саед Ахмед распавёў пра асноўныя прыярытэтныя кірункі развіцця Егіпта, паслядоўныя змены і важнасць супрацоўніцтва з Беларуссю на любым узроўні. Ён адзначыў, што сёння адносіны дзвюх дзяржаў грунтуюцца на калектыўным абмеркаванні і ўзаемавыгадных рашэннях. Алі Абдэль Аль Саед Ахмед падзякаваў кіраўніцтву БДУ за высокі давер быць ганаровым прафесарам вядучай ВНУ Беларусі і выказаў спадзяванне на актыўнае развіццё супрацоўніцтва дзвюх краін.

Таксама падчас сустрэчы рэктара БДУ Андрэя Караля і Алі Абдэля Аль Саеда Ахмеда была адзначана важнасць умацавання міжуніверсітэцкага супрацоўніцтва. БДУ ў наш час узаемадзейнічае з пяццю егіпецкімі ўніверсітэтамі і кампаніямі. Бакі прадэманстравалі магчымасці пашырэння партнёрства, падкрэсліўшы важнасць ролі ўніверсітэтаў у развіцці дзяржаў і рэалізацыі гуманістычных ідэй грамадства.

У завяршэнне сустрэчы Алі Абдэль Аль Саед Ахмед пакінуў запіс у кнізе ганаровых гасцей БДУ і ўручыў рэктару Андрэю Каралю памятны медаль «150-годдзе Палаты прадстаўнікоў Арабскай Рэспублікі Егіпет».

Алена МАРЦУЛЕВІЧ

Даведка

У наш час у БДУ дзейнічаюць дамовы пра супрацоўніцтва з Каірскім універсітэтам; Нацыянальным даследчым цэнтрам; Цэнтральным інстытутам металургічных даследаванняў і развіцця; Егіпецкім універсітэтам навукі і тэхналогій; егіпецкай кампаніяй Space Applications and Remote Sensing. На ФМА БДУ функцыянуе сектар арабскай мовы кафедры мовазнаўства і краіназнаўства Усходу. У БДУ арабскую мову вывучаюць 18 студэнтаў.

ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

МЕМАРАНДУМ аб супрацоўніцтве падпісаны паміж БДУ і Рэспубліканскім інстытутам павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі работнікаў сферы адукацыі (РІПКРА, Таджыкістан) на сустрэчы прарэктара па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях Вольгі Чупрыс і рэктара РІПКРА Ханалі Курбанзада.

Прадугледжваецца садзейнічанне ў арганізацыі курсаў павышэння кваліфікацыі, семінараў, канферэнцый, круглых сталоў, падрыхтоўкі магістрантаў, аспірантаў, перападрыхтоўкі работнікаў РІПКРА.

У рамках падзеі гасцям прадставілі адукацыйную, навукова-даследчую і міжнародную дзейнасць нашага ўніверсітэта. Асаблівая ўвага была нададзена адукацыйным праграмам ФПКП БДУ. Гаворка ішла пра кірунки, звязаныя з педагагічнымі і інфармацыйнымі тэхналогіямі, эканомікай і менеджментам, кіраваннем персаналам, камунікацыямі, моўнай падрыхтоўкай і інш.

СУПРАЦОЎНІКІ Шэньянскага ўніверсітэта (КНР) прайшлі ў БДУ навучальныя курсы «Мадэрнізацыя вышэйшай адукацыі: традыцыі і наватарства». Заняткі арганізаваў з 13 па 17 лістапада факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі.

Першую лекцыю правёў прарэктар па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі БДУ Сяргей Ходзін. Ён распавёў пра вышэйшую адукацыю ў Беларусі. Таксама ў якасці спікераў выступілі прарэктар па навуковай рабоце БДУ Васіль Сафонаў, прарэктар па выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Іван Янушэвіч, намеснік дырэктара РІК імя Канфуцыя Вячаслаў Лявонаў, загадчык кафедры тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій ФРКТ Юрый Варатніцкі і намеснік начальніка ГУАД Людміла Хухлындзіна.

Падчас навучання слухачы пазнаёміліся з навукова-адукацыйнай дзейнасцю БДУ, досведам супрацоўніцтва з КНР, сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі ў адукацыі, арганізацыі кіравання ўніверсітэтам, выхаваўчай і сацыяльнай працы. У рамках курсаў для гасцей зладжана культурная праграма.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

Мадэрнізаваць змест адукацыі

Стратэгію лічбавай трансфармацыі БДУ абмеркавалі на савеце ўніверсітэта. Дадзеная канцэпцыя ўпершыню прадстаўлена ў сістэме вышэйшай адукацыі нашай краіны.

Старшыня савета па лічбавай трансфармацыі Юрый Варатніцкі

У адрозненне ад традыцыйнай інфарматызацыі, лічбавая трансфармацыя дазволіць мадэрнізаваць змест адукацыі і тэхналогій навучання, аптымізаваць асноўныя працэсы дзейнасці ўніверсітэта і яго структуру.

Пра мэты, прынцыпы, этапы, тэрміны і мерапрыемствы рэалізацыі стратэгіі распавёў старшыня савета па лічбавай трансфармацыі **Юрый Варатніцкі.** Праца над праектам стратэгіі ажыццяўлялася на працягу года з прыцягненнем прадстаўнікоў розных факультэтаў і падраздзяленняў ВНУ.

Асноўная мэта лічбавай трансфармацыі заключаецца ў мадэрнізацыі зместу адукацыі і тэхналогій навучання, аптымізацыі дзейнасці ўніверсітэта і яго структур. У цэнтры стратэгіі – асоба студэнта, раскрыццё яго індывідуальных здольнасцяў. Праект прадугледжвае ўкараненне сістэмы эўрыстычнага, дыялогавага навучання, выбар дысцыплін і пераход на індывідуальныя тэрміны вывучэння асобных курсаў, творчую самарэалізацыю студэнтаў, развіццё ў іх крытычнага мыслення і крэатыўных здольнасцяў, стварэнне ўласнага адукацыйнага прадукту навучэнцаў.

У БДУ ўжо распрацаваны камплект творчых заданняў па розных дысцыплінах, праведзена больш за 100 заняткаў па новых методыках эўрыстычнага, дыялогавага навучання, у тым ліку – у дыстанцыйнай форме. Больш за 500 выкладчыкаў прынялі ўдзел у анлайн-семінарах па гэтых методыках. У найбліжэйшай перспектыве таксама развіццё анлайн-навучання, экспарту дыстанцыйных адукацыйных паслуг.

У ліку палажэнняў стратэгіі – выкананне студэнтамі пісьмовых прац у электронным выглядзе з абавязковай праверкай у сістэме «Антыплагіят». Для гэтага будзе створаны агульнаўніверсітэцкі рэпазітарый прац, які забяспечвае іх захаванасць і цэласнасць.

У аснову стратэгіі пакладзены лічбавая трансфармацыя сістэмы кіравання, мадэрнізацыя асноўных бізнес-працэсаў, інтэрнэт-сайтаў БДУ, беспапяровыя тэхналогіі. Лічбавыя фарматы дакументаў дазваляюць эканоміць сродкі і аптымізаваць атэстацыйны працэс. У 2018 годзе ўкараненне новых студэнцкіх квіткоў на аснове міжнародных банкаўскіх картак ужо дазволіла зэканоміць каля 40 тыс. рублёў. Наступны этап – увядзенне электронных заліковак, якія возьмуць на сябе ўсе функцыі друкаванага носьбіта.

Планаванне працы выкладчыкаў, іх справаздачы аб выкананні навучальных планаў, журналы куратараў і іншыя дакументы будуць весціся толькі ў электронным выглядзе ў асабістых кабінетах выкладчыкаў на ўнутраным сайце БДУ.

У наш час у БДУ выкладанне шэрагу дысцыплін вядзецца дыстанцыйна. Для іх ажыццяўлення ў будучыні плануецца прыцягненне замежных выкладчыкаў. Стратэгія прадугледжвае стварэнне цэнтра адкрытай адукацыі, рэалізацыю палітыкі інтэрнацыяналізацыі ўніверсітэцкай адукацыі на лічбавых платформах.

Адзначана, што анансаваная год назад аўтаматызаваная рэйтынгавая сістэма дадатковага матэрыяльнага стымулявання выкладчыкаў паспяхова распрацавана і ўкаранёная ў БДУ.

Пасяджэнне прайшло 26 лістапада. Яго ўдзельнікамі сталі кіраўнікі факультэтаў і інстытутаў, дырэктары прадпрыемстваў комплексу БДУ, начальнікі галоўных упраўленняў і ўпраўленняў, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

У фокусе ўвагі – замежныя студэнты

Удасканаленне навучальнай і арганізацыйнай работы з замежнымі студэнтамі стала галоўнай тэмай пашыранага пасяджэння рэктарата.

Яго ўдзельнікамі сталі дэканы, дырэктары навучальных інстытутаў, кіраўнікі структурных падраздзяленняў ВНУ.

Прадстаўленыя дадзеныя аналізу апытання студэнтаў-замежнікаў паказалі ступень здаволенасці якасцю адукацыі ў БДУ, іх запатрабаванні і некаторыя праблемы. Адной з іх з'яўляецца нізкая моўная падрыхтоўка студэнтаў, якая адбіваецца на ўсім навучальным працэсе і засваенні матэрыялу. Рашэнне бачыцца ў распрацоўцы сістэмы дадатковых заняткаў па розных прадметах для замежных студэнтаў.

Актуальным для БДУ застаецца павелічэнне экспарту адукацыйных паслуг, долі замежных грамадзян, павышэнне ўзроўню развіцця акадэмічнай мабільнасці. Удзельнікі нарады разгледзелі прапановы па дасягненні росту гэтых паказчыкаў. Перспектыва відавочная ў пашырэнні геаграфіі экспарту адукацыйных паслуг, узмацненні рэкламнай і інфармацыйнай дзейнасці па папулярызацыі адукацыі БДУ за мяжой, развіцці блока спецыяльнасцяў на англійскай мове на розных ступенях навучання. Рэкамендавана ў найбліжэйшы час давесці да ПВС інфармацыю пра стымулюючую сістэму па падрыхтоўцы замежных навучэнцаў, а таксама прапрацаваць стандарты новых формаў партнёрскіх адносін.

На пасяджэнні таксама абмеркавалі аптымізацыю выхаваўчай работы са студэнтамі. Прапанавана дапрацаваць электронную базу рэзюмэ выпускнікоў БДУ з улікам грамадскай дзейнасці навучэнца, яго дасягненняў у галіне адукацыі і навукі. Таксама ўдзельнікам рэктарата была прадстаўлена інфармацыя пра памяншэнне ўнутранага дакументазвароту ў БДУ.

Алена МАРЦУЛЕВІЧ

НАВУКА Ў БДУ

Ад ідэі да інавацыйнага прадукту

Нароўні з адукацыяй навука – адзін з найважнейшых напрамкаў, якія вызначаюць развіццё нашага ўніверсітэта. Даследаванні, выкананыя на факультэтах і ў падраздзяленнях БДУ, каардынуе Галоўнае ўпраўленне навукі, якое ў гэтыя дні адзначае 55-годдзе.

Мы пагаварылі з яго начальнікам, намеснікам прарэктара па навуковай рабоце **Віталём КУТАВІЧУСАМ,** і даведаліся, як стымуляваць супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта займацца навукай, як зарабляць на навуковых ідэях і пры якіх умовах БДУ ўвойдзе ў 1 % найлепшых ВНУ свету.

– У якім кірунку, па вашым меркаванні, павінна развівацца ўніверсітэцкая навука?

– Я падзяляю погляды, што сёння развіццё навукі звязана з міждысцыплінарным падыходам да арганізацыі даследаванняў. На шляху такога развіцця стаяць праблемы навуковай камунікацыі, абмену інфармацыяй і ведамі. Бывае, што навуковыя калектывы, выкладчыкі ці студэнты на якім-небудзь факультэце не могуць вырашыць пытанні, каб рухацца далей у сваіх навуковых працах ці стварыць даследчыя праекты, і не ведаюць, што гэтыя пытанні ўжо даўно і паспяхова вырашаюць на іншым факультэце з пункта гледжання тэорыі і метадаў даследавання. Калі пачнуць разам актыўна працаваць розныя па кірунках навуковай дзейнасці факультэты, НДІ, магчыма, прадпрыемствы, можна будзе стварыць сапраўды інавацыйны прадукт. З гэтай мэтай створаны і пачаў працу савет па міждысцыплінарных даследаваннях БДУ, які стане пляцоўкай для пошуку агульных інтарэсаў і стварэння сумесных праектаў.

– Фактычна Вы закранулі арганізацыю кластара. Але ж ва ўніверсітэце ўжо створаны і дзейнічаюць кластары.

– Сапраўды, у нас ёсць дзейныя кластары. У якасці прыкладу – кластар хімічнага профілю, куды ўваходзяць хімічны факультэт, НДІ ФХП і прадпрыемствы «Унітэхпрам БДУ» і «Унікаштмет БДУ». Кластары ствараюцца, па вялікім рахунку, для таго, каб навукоўцы рэалізоўвалі свае ідэі ў гатовым прадукце, які выпускае прадпрыемства. Цяпер мы будзем разглядаць працэсы стварэння і дзейнасці кластараў менавіта з гэтай пазіцыі, у аснове іх функцыянавання павінна ляжаць камерцыялізацыя навуковай дзейнасці. Актыўна будуць ствараца кластары міждысцыплінарнага характару. Нельга выпускаць з-пад увагі і падрыхтоўку спецыялістаў падчас дзейнасці кластара. Трэба прыцягваць у праекты, якія рэалізуюцца кластарам, студэнтаў. Вядома, не факт, што ўсе студэнты стануць у выніку навукоўцамі, але, калі яны падчас вучобы будуць уключаны ў гэты інавацыйны ланцужок, будуць разумець, як праходзяць усе этапы ад ідэі да выпуску прадукцыі, яны будуць запатрабаваны на рынку працы і змогуць стаць спецыялістамі на любым іншым прадпрыемстве такога ж кірунку, а можа і стварыць паспяховы стартап.

– Прадаваць свой прадукт – гэта задача навукоўцаў?

– На гэта пытанне няма адназначнага адказу. Для сапраўды добрага навукоўца марнаваць час не на навуку, а на камерцыю не зусім прадуктыўна. Але, з іншага боку, сёння няма базавага фінансавання навукі, і навукоўцы павінны шукаць крыніцы фінансавання навуковых даследаванняў, зарабляць у прамым сэнсе гэтага слова.Нельга паставіць на паўзу свае фундаментальныя даследаванні, якімі вельмі хочацца займацца, зрабіць штосьці прыкладное, атрымаць патэнт і зарабіць на гэтым грошы. І ўжо потым займацца навукай, імкнучыся атрымаць у першую чаргу не фінансавую карысць, а навуковы вынік. У сучасных умовах навукоўцу даводзіцца спалучаць гэтыя кірункі дзейнасці. За мяжой многія прафесары вядомых універсітэтаў ствараюць прадпрыемствы і атрымліваюць адлічэнні, гэта значыць зарабляюць на сваіх ідэях. Гэта ідэальная сітуацыя, калі ёсць той, хто генеруе ідэю, хто даводзіць яе да ўзору, менеджар, які арганізуе вытворчасць, маркетолаг, які прасоўвае прадукт і знаходзіць пакупніка. Але, з іншага боку, толькі сам навуковец лепш за астатніх ведае патэнцыял сваёй ідэі і рынак для яе. На этапах гэтага шляху ўніверсітэт у асобе Галоўнага ўпраўлення навукі аказвае навукоўцу садзейнічанне і падтрымку. У рамках мадэлі «Універсітэт 3.0» сёння, рыхтуючы спецыялістаў, мы павінны вучыць студэнта першапачаткова ацэньваць сваю ідэю не толькі з пункта гледжання навуковай значнасці, але і з пункта гледжання камерцыйнай прывабнасці, вучыць прадпрымальніцтву.

– Паспяхова весці навуковую дзейнасць прыкладнога характару і камерцыялізаваць навуковыя вынікі больш шанцаў у прыродазнаўчых кірункаў. А што рабіць гуманітарыям?

– Камерцыйная значнасць вынікаў сацыяльна-гуманітарных даследаванняў у цэлым ніжэйшая, але гэта не азначае, што яе няма зусім. І ёсць паспяховыя прыклады даследаванняў нашых гуманітарыяў, вынікі якіх запатрабаваны на рынку. Напрыклад, у Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ вельмі развітая пазабюджэтная дзейнасць. Гістарычны факультэт выканаў цікавую замову для піўзавода «Аліварыя»: даследаванне, звязанае з гісторыяй заснавання прадпрыемства. Магчымасці для камерцыялізацыі ёсць. ГУН адсочвае на электронных пляцоўках Беларусі і Расіі закупку навуковых паслуг і навуковых прац, перадае інфармацыю пра лоты факультэтам, прапануе ўдзельнічаць у конкурсах на выкананне праектаў.

– Пры якіх умовах, на Ваш погляд, БДУ можа ўвайсці ў 1 % найлепшых універсітэтаў свету?

– Такія планы пастаўлены, і яны досыць амбіцыйныя. Трэба разумець, што пасля таго, як БДУ ўвайшоў у сістэму рэйтынгаў, наша пазіцыя першыя гады хутка расла. На мой погляд, гэтага мы дамагаліся тым, што прыводзілі ў парадак у адпаведнасці з патрабаваннямі ўсё, што ў нас было. Напрыклад, змянялі структуру і запаўнялі неабходнай інфармацыяй універсітэцкія сайты, фарміравалі электронную бібліятэку. Тады мы выконвалі патрабаванні «адпаведнасці», зараз жа мы павінны працаваць на фактычны рост паказчыкаў. У плане навуковага складніку рэйтынгу: павялічваць колькасць публікацый у высакарэйтынгавых часопісах, долю «аступененых» супрацоўнікаў і г. д. У кожным рэйтынгу свая сістэма крытэрыяў, працаваць над іх выкананнем павінен увесь універсітэт.

– Як плануецца павялічваць публікацыйную актыўнасць?

– Па-першае, у наступным навучальным годзе ў поўную сілу запрацуе сістэма рэйтынгу ПВС. Адзін са значных блокаў рэйтынгу – публікацыйная актыўнасць, індэкс цытавання. За артыкулы людзі будуць атрымліваць балы, і гэта паўплывае на памер прэміі. Падругое, мяркуецца асобна стымуляваць супрацоўнікаў публікаваць артыкулы ў высакарэйтынгавых часопісах. Для гэтага распрацавана і цяпер праходзіць зацвярджэнне кіраўніцтвам БДУ Палажэнне аб прэміраванні за публікацыі ў вядучых міжнародных часопісах. Кожны факультэт будзе падаваць інфармацыю пра публікацыі супрацоўнікаў у мінулым годзе, а БДУ фінансава будзе заахвочваць топ аўтараў факультэта, якія маюць публікацыі ў высакарэйтынгавых часопісах.

– У БДУ высокая эфектыўнасць працы аспірантуры, але ў той жа час задача павялічваць долю «аступененых» супрацоўнікаў застаецца?

– ГУН актыўна працуе ў галіне падрыхтоўкі навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі, і ў апошнія гады мы маем самы высокі паказчык эфектыўнасці працы аспірантуры ў сістэме Міністэрства адукацыі. Але ёсць другі кірунак, па якім мы павінны працаваць – стымуляваць абараняцца тых супрацоўнікаў, якія не вучыліся ў аспірантуры ці вучыліся, але не абараніліся. Гэта складаней, таму што, калі чалавек вучыцца ў аспірантуры, ён мэтанакіравана піша дысертацыю, а калі ўжо выкладае, то яму неабходна знайсці час, сілы і сродкі для дысертацыйнага даследавання. Ёсць і іншыя праблемы, звязаныя з абаронай супрацоўнікаў з вялікім стажам працы, у прыватнасці, у 2011 г. быў прыняты нарматыўны акт пра павышэнне тарыфных акладаў прадстаўнікоў ПВС, якія не маюць навуковай ступені, на 50 %. І ў выніку атрымліваецца, што розніца паміж зарплатамі супрацоўніка са ступенню і без ступені, але з вялікім стажам працы, зусім нязначная. І ў апошніх проста няма матывацыі абараняцца. Вастрыню гэтай праблемы павінна згладзіць увядзенне сістэмы дадатковага стымулявання работнікаў БДУ з ліку ПВС у адпаведнасці з рэйтынгам, захады Стратэгіі развіцця кадравага патэнцыялу БДУ. Дадатковым стымулам для супрацоўнікаў пісаць дысертацыі і выходзіць на абарону будзе ўвядзенне ў гэтым навучальным годзе новага фінансавага механізму: конкурсу грантаў рэктара. Пры распрацоўцы нарматыўнай базы конкурсу грантаў мы выкарыстоўвалі досвед Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Мэта грантаў – дапамагчы людзям абараніцца, даць сродкі на неабходныя перад абаронай дзеянні: апублікаваць артыкул, з'ездзіць у камандзіроўку, правесці эксперымент. Гранты плануюцца двух тыпаў: кароткатэрміновыя на тэрмін да года і доўгатэрміновыя – да 3 гадоў. Умовы такія: чалавек выйграе конкурс, заключае з універсітэтам дамову і атрымлівае фінансаванне. ГУН, вядома, будзе забяспечваць кантроль выканання такіх прац. Дамова будзе лічыцца выкананай, калі супрацоўнік комплексу БДУ да канца тэрміну гранта прадставіў дысертацыю да абароны, а яшчэ лепш – абараніўся. Я ўпэўнены, што мэта развіцця навуковай сферы БДУ – павелічэнне долі «аступененых» работнікаў БДУ з ліку ПВС і навуковых супрацоўнікаў – будзе дасягнута.

Валерыя БАНДАРЧЫК

БДУ пашырае прысутнасць у Кітаі

Трохбаковая дамова пра арганізацыю сумеснай праграмы па навучанні рускай мове як замежнай з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій падпісана паміж БДУ,»ЭХУА» (КНР) і Беларуска-кітайскім цэнтрам сяброўства і супрацоўніцтва (г. Пекін, КНР).

Подпісы пад дакументам паставілі прарэктар па эканоміцы і матэрыяльна-тэхнічным развіцці БДУ **Міхаіл Чарапеннікаў** і кіраўнікі кітайскіх арганізацый Хоу Мінмін, Ван Яацянь адпаведна. Цырымонія адбылася ў рамках афіцыйнага візіту дэлегацыі БДУ ў Кітай. У яе ўвайшлі таксама начальнік упраўлення міжнародных сувязяў **Ларыса Лукіна,** дэкан факультэта журналістыкі **Вольга Самусевіч,** намеснік дэкана факультэта даўніверсітэцкай адукацыі **Аляксандр Жук.**

Дадзены дакумент прадугледжвае моўную падрыхтоўку кітайскіх абітурыентаў і далейшае іх навучанне на першай ступені вышэйшай адукацыі на факультэце журналісткі БДУ. Першапачаткова заняткі пройдуць у Кітаі на базе філіялаў інфармацыйна-адукацыйнага цэнтра БДУ ў КНР (у Хунанскім універсітэце і Саньяскім інстытуце авіяцыі і турызму), а на другім этапе – на ФДА БДУ.

Адкрыццё філіяла інфармацыйна-адукацыйнага цэнтра БДУ ў КНР на базе Хунанскага ўніверсітэта (КНР) адбылося таксама ў рамках дадзенага візіту. Адзначым, сёння ў БДУ функцыянуюць ідэнтычныя структуры ў цэлым шэрагу гарадоў Турцыі і Кітая. Іх дзейнасць накіравана на рэалізацыю сумесных адукацыйных праграм па вывучэнні замежнымі грамадзянамі рускай мовы, іх падрыхтоўку да паступлення ў БДУ і папулярызацыю навукова-адукацыйнай дзейнасці беларускай ВНУ за мяжой. Дарэчы, на базе Хунанскага ўніверсітэта ўжо стартавала прыёмная кампанія па наборы слухачоў для навучання рускай мове.

У рамках візіту ў Кітай адбыліся сустрэчы прадстаўнікоў БДУ з кіраўніцтвам кампаніі па кансультатыўным абслугоўванні замежнага навучання «Цзінь Цзіле», Педагагічнага ўніверсітэта Унутранай Манголіі, Універсітэта Санья, Саньяскага інстытута авіяцыі і турызму, Саньяскай вышэйшай сярэдняй школы № 1, адукацыйнай кампаніяй «Сіфанг» (г. Далянь). Былі разгледжаны пытанні супрацоўніцтва і рэалізацыі сумесных праграм, адбыліся прэзентацыі навуковых і адукацыйных магчымасцяў БДУ. Праведзеныя перамовы дазволяць пашырыць інфармацыйную прысутнасць БДУ ў рэгіёне з высокай цікавасцю да вывучэння рускай мовы. Перспектыўным бачыцца адкрыццё сумеснай праграмы па навучанні гэтай мове ў шэрагу школ, дзе яна з'яўляецца першай замежнай і вывучаецца тры гады.

Алена МАРЦУЛЕВІЧ

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС
НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: тэарэтычнай фізікі і астрафізікі; лазернай фізікі і спектраскапіі; тэарэтычнай і прыкладной механікі; карпаратыўных фінансаў; раманскага мовазнаўства.

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: міжнародных адносін; дзяржаўнага кіравання.

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: тэорыі функцый; тэарэтычнай і прыкладной механікі; батанікі; фізікі і аэракасмічных тэхналогій; гісторыі журналістыкі і менеджменту СМІ; тэлебачання і радыёвяшчання; тэхналогій камунікацыі; стылістыкі і літаратурнага рэдагавання; раманскага мовазнаўства; гісторыі беларускай мовы; рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры; гісторыі беларускай літаратуры; дзяржаўнага кіравання.

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: ядзернай фізікі; шматпрацэсарных сістэм і сетак; квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі; інфарматыкі і камп'ютарных сістэм; сістэмнага аналізу і камп'ютарнага мадэлявання; фізікі і аэракасмічных тэхналогій; фізічнага выхавання і спорту; тэлебачання і радыёвяшчання; перыядычнага друку; тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай; германскіх моў; дзяржаўнага кіравання.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.

ІНСТЫТУТ БІЗНЕСУ БДУ
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС
НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫК КАФЕДРЫ інавацыйнага кіравання.

ДАЦЭНТ КАФЕДРЫ міжнароднага бізнесу.

ДАЦЭНТ КАФЕДРЫ інавацыйнага кіравання.

ДАЦЭНТ КАФЕДРЫ маркетынгу.

СТАРШЫ ВЫКЛАДЧЫК кафедры эканомікі і менеджменту.

СТАРШЫ ВЫКЛАДЧЫК кафедры бізнес-адміністравання.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Інстытут бізнесу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта», тэл. 306-00-27, 306-00-28.

E-mail: sbmt@sbmt.by, http://www.sbmt.by, mail@e-edu.by

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

У БДУ распрацаваны электронныя заліковыя кніжкі – БелТА, zviazda.by, kv.by, mail.ru, sputnik.by, bsb.by/«Белсвісбанк», gp.by/«Праўда Гомель», belnovosti.by, lelchitsy.by/«Светлае жыццё» (22.11), «Звязда», ekonomist.by, bobruin.by, bykhov.by, otdelkadrov.by (23.11), «Рэспубліка», sb.by (24.11), БТ-1, радыё «Сталіца», hotimsk.by (26.11).

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Егіпта Алі Абдэль Аль Саед Ахмед стаў ганаровым прафесарам БДУ – sputnik.by, БелТА, news.yandex, belarus24.by, wuz.by, БТ-1 (16.11), АНТ, sb.by (17.11).

Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Досвед кітайскай палітыкі рэформаў і адкрытасці і яго актуальнасць для беларускай мадэлі ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця» пройдзе ў БДУ – zviazda.by, БелТА, rambler.ru, wuz.by, ratenews.ru (26.11).

Ваенны факультэт БДУ прызнаны найлепшым сярод профільных факультэтаў устаноў вышэйшай адукацыі – news.yandex.by (22.11), interfax.by, mil.by (23.11), БелТА, bobruin.by (26.11).

Міжуніверсітэцкі паэтычны форум прайшоў у БДУ – wuz.by (08.11), zviazda.by (11.11), sb.by, «СБ. Беларусь сёння» (29.11).

Акцыя «Растопім лёд разам» адбылася ў БДУ – wuz.by (13.11), «Мінск-навіны» (14.11), sb.by (15.11), zviazda.by, tio.by (16.11).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

УНІВЕРСІТЭТ
7 снежня 2018 года, № 17 (2205)

УНІВЕРСІТЭТ
7 снежня 2018 года, № 17 (2205)



На скрыжаванні ўсіх хімій

У 1968 г. была створана кафедра радыяцыйнай хіміі і радыяхіміі для падрыхтоўкі спецыялістаў, неабходных для вырашэння разнапланавых задач па мірным выкарыстанні атамнай энергіі.
Яе арганізаваў і ўзначаліў Я. П. Пятраеў. Першапачаткова навучальная праца была звязана з выкладаннем дысцыплін па радыяцыйнай хіміі, радыяхіміі і крыніцах іанізуючых выпраменьванняў. Чытаць лекцыі запрашаліся спецыялісты з МДУ, супрацоўнікі адкрытага ў 1964 г. Інстытута ядзернай энергетыкі. Свае кадры трэба было навучыць у сціслыя тэрміны.

Для чаго былі патрэбныя радыяцыйныя тэхналогіі

Як студэнт другога выпуску, памятаю выдатныя лекцыі прафесара Наталлі Аляксееўны Бах і яе вучняў – прафесара Л. Ц. Бугаенкі і дацэнта Я. П. Калязіна – яркіх прадстаўнікоў школы радыяцыйнай хіміі з МДУ, а таксама выкладанне радыяхімічных дысцыплін Я. П. Пятраевым і Ю. П. Давыдавым, прадстаўнікамі вядомай Ленінградскай школы радыяхімікаў, якія пераехалі ў Мінск з Ленінграда. Гэта стала асновай для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. З нашага другога выпуску кафедры 1971 года – а гэта 25 чалавек – большасць атрымала працу ў Інстытуце ядзернай энергетыкі ў лабараторыях аддзелаў радыяцыйна-хімічнага сінтэзу і радыяхіміі. У 1970–1980 гг. радыяцыйныя тэхналогіі спрабавалі небеспаспяхова ўкараніць у шматлікія сферы тэхналагічнай дзейнасці. У першую чаргу гэта радыяцыйная мадыфікацыя і сшыўка палімерных матэрыялаў, радыяцыйна-хімічны сінтэз арганічных рэчываў з хімічна агрэсіўнай сыравіны (сульфхларыраванне, сульфгалагеніраванне і г. д.), радыяцыйная стэрылізацыя і кансерваванне медыцынскай і сельскагаспадарчай прадукцыі, радыяцыйныя тэхналогіі абеззараджвання і ачысткі прамысловых і сельскагаспадарчых адходаў, радыяцыйныя тэхналогіі для сельскай гаспадаркі, звязаныя з павышэннем пасяўных якасцяў насення і паляпшэннем пажыўнасці грубых кармоў і многае іншае.

Фактар Чарнобыля

Пасля аварыі на ЧАЭС пры кафедры ў 1986 г. быў арганізаваны сектар радыяхіміі, а ў 1993 г. – НДЛ радыяхіміі. Супрацоўнікамі НДЛ радыяхіміі выканана больш за 30 прац у рамках дзяржаўных, ведамасных і міжнародных праграм, накіраваных на пераадоленне наступстваў катастрофы на ЧАЭС. Асноўнымі кірункамі навуковай дзейнасці з'яўляліся комплексная ацэнка радыеэкалагічнай сітуацыі ў розных рэгіёнах РБ; даследаванне фізіка-хімічнага стану, механізмаў і дынамікі біягеахімічнай міграцыі радыенуклідаў у асноўных кампанентах наземных экасістэм, у тым ліку ў сістэмах «глеба – расліна», «глеба – грунтавыя воды», «донныя адкладанні – паверхневыя воды» і інш. Адмысловая ўвага надавалася вывучэнню паводзін у навакольным асяроддзі трансуранавых элементаў, якія іграюць важную ролю ў ядзерным паліўным цыкле.

Энергетычны парадокс выпраменьвання

Адным з кірункаў даследаванняў, што праводзяцца на кафедры, якой я з 1994 года стаў кіраваць, было вывучэнне заканамернасцяў дзеяння радыяцыі на біялагічна важныя рэчывы. Агульнавядомае магутнае пашкоджвальнае дзеянне іанізуючых выпраменьванняў на арганізм, 10 Гр = 10 Дж/кг – смяротная доза для ўсіх млекакормячых. Чаму гэта адбываецца, дагэтуль не зразумела. Хоць распрацаваны асноўныя прынцыпы пашкоджвальнага дзеяння на біяаб'екты, у той жа час энергетычны парадокс уздзеяння выпраменьвання на арганізм не вырашаны. Такія веды патрэбныя, таму што яны адкрываюць перспектыву накіраванага атрымання рэчываў, якія або валодаюць радыеахоўнымі ўласцівасцямі, або, наадварот, узмацняюць дзеянне выпраменьвання на біялагічныя аб'екты. Да апошніх адносяцца рэчывы (радыесенсібілізатары), якія выкарыстоўваюцца ў радыетэрапіі анкалагічных захворванняў, паколькі ракавыя клеткі больш устойлівыя да апрамянення, чым большасць здаровых.

Паварот да лекавых злучэнняў

Гэты кірунак працы кафедры паслужыў для мяне адной з адпраўных кропак, калі пасля распаду СССР у нас у краіне склалася няпростая сітуацыя з кадравым забеспячэннем фармацэўтычнай прамысловасці. Спецыялістаў для фармпрамысловасці ў Беларусі не рыхтавалі. Таму па нашай ініцыятыве са згоды канцэрна «Белбіяфарм» і Міністэрства аховы здароўя РБ у 1995 г. на базе кафедры была адкрыта новая спецыялізацыя «Хімія лекавых злучэнняў», а сама яна атрымала сённяшнюю назву «Кафедра радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій». Вось ужо больш за 20 гадоў кафедра праводзіць падрыхтоўку спецыялістаў для патрэб фармацэўтычнай прамысловасці. Выпускнікі кафедры працуюць на ўсіх фармацэўтычных прадпрыемствах краіны і ў навуковых інстытутах, якія займаюцца распрацоўкай лекавых сродкаў, забяспечваючы ўкараненне ў вытворчасць сучасных тэхналогій і стварэнне інавацыйных лекаў.

Унікальнае абсталяванне

З 2008 года па пастанове ўрада мы аднавілі падрыхтоўку спецыялістаў па кірунку «радыяцыйная хімія і радыяхімія», неабходных для працы на Беларускай атамнай станцыі і для наладжвання выпуску радыяфармпрэпаратаў рознага прызначэння. Удзел нашай кафедры ў дзвюх дзяржаўных праграмах, звязаных з падрыхтоўкай кадраў для атамнай энергетыкі і фармацэўтычнай прамысловасці, а таксама атрыманне на конкурснай аснове 3 грантаў Міжнароднага навукова-тэхнічнага цэнтра дазволілі здабыць значныя сродкі на развіццё прыборнай базы кафедры, закупку дарагіх рэактываў і камплектуючых, у выніку былі аснашчаны сучасным абсталяваннем як навучальныя практыкумы, так і навуковыя лабараторыі.

Запатрабаванасць выпускнікоў

У наш час кафедра штогод выпускае 50–60 спецыялістаў, большасць з якіх уладкоўваецца на прадпрыемствы, дзе патрэбныя супрацоўнікі, якія валодаюць ядзернымі і фармацэўтычнымі ведамі, а таксама маюць навыкі працы на сучасным аналітычным абсталяванні. Пералік такіх прадпрыемстваў шырокі – ад АЭС і буйных фармацэўтычных заводаў тыпу РУП «Белмедпрэпараты» да недзяржаўных фірмаў і кампаній.

Адкрыцці і распрацоўкі

Навуковыя дасягненні кафедры значныя. Гэта адкрыццё новых свабоднарадыкальных рэакцый, якія праходзяць з удзелам біялагічна важных злучэнняў. Распрацоўка новых тэарэтычных канцэпцый пашкоджвання арганізма пры дзеянні на яго стрэсфактараў і стварэнне на гэтай аснове метадаў рацыянальнага пошуку лекавых прэпаратаў. Сумесна з калегамі з БДМУ і РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі адкрыты новы клас антывірусных сродкаў. Сумесна з РУП «Белмедпрэпараты» ўкаранёныя ў прамысловую вытворчасць антывірусныя лекавыя сродкі ***«Бутамінафен»*** і ***«Актавір»***, якія на сёння з'яўляюцца найбольш эфектыўнымі прэпаратамі для лячэння герпетычных інфекцый.

Распрацаваны новыя падыходы да пошуку фармакалагічна актыўных рэчываў, якія валодаюць супрацьпухліннай і нейратропнай актыўнасцямі на аснове поліфункцыянальных рэгулятараў свабоднарадыкальных працэсаў у арганізме.

Атрыманыя веды дазволілі сумесна з прадпрыемствам «Клуб «Фарм-Эка» (Драгічын) распрацаваць метады стабілізацыі льнянога алею і наладзіць выпуск стабілізаванага ***харчовага льнянога алею*** і шасці БАД на яго аснове, якія можна купіць ва ўсіх крамах і аптэках.

Супрацоўнікі

Калектыў кафедры і яе навуковых лабараторый складаецца з 30 чалавек, сярод якіх вялікая частка – гэта перспектыўныя 30–40-гадовыя супрацоўнікі, якія звязаны з кафедрай са студэнцкіх гадоў.

Я, як загадчык кафедры, аптымістычна гляджу ў будучыню і жадаю ўсім супрацоўнікам моцнага здароўя і велізарнага задавальнення ад творчых спраў.

Прафесар Алег ШАДЫРА,
загадчык кафедры радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій



Святаслаў БРЫНКЕВІЧ, к. х. н., дацэнт, загадчык ізатопнай цыклатронна-радыехімічнай лабараторыі аддзялення пазітронна-эмісійнай тамаграфіі РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава

Прыйшоўшы ў студэнцкую лабараторыю на кафедру радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій зялёным першакурснікам, адразу патрапіў у дружны калектыў студэнтаў старэйшых курсаў. Даводзілася інтэнсіўна працаваць, хутка асвойваць методыкі, шмат чытаць навуковай перыёдыкі, каб ні ў чым не саступаць калегам. У 2006 г. паступіў у аспірантуру, дзе пад кіраўніцтвам прафесара А. І. Шадыры заняўся вывучэннем свабоднарадыкальных ператварэнняў водарастваральных вітамінаў і каэнзімаў. У 2010 г. абараніў дысертацыю па радыяцыйнай хіміі аскарбінавай кіслаты і яе вытворных. Чытаў лекцыйныя курсы, вёў лабараторныя практыкумы для студэнтаў хімічнага і фізічнага факультэтаў, якія навучаюцца ў рамках дзяржпраграмы падрыхтоўкі кадраў для ядзернай энергетыкі Беларусі.

У 2012 г. пачаліся працы па стварэнні Рэспубліканскага цэнтра пазітронна-эмісійнай тамаграфіі – першай ў Беларусі вытворчасці радыеактыўных ін'екцыйных лекавых сродкаў, пераважна для высокаспецыфічнай дыягностыкі анкалагічных захворванняў. І калі распрацоўшчыкі звярнуліся на кафедру з пытаннямі пра сінтэз арганічных злучэнняў, мечаных пазітронвыпраменьваючымі нуклідамі, Алег Іосіфавіч папрасіў мяне, маладога навуковага супрацоўніка, дапамагчы праекціроўшчыкам з тэхналогіяй лекаў і радыяхіміяй. Праз два гады актыўнай працы кансультантам у праекце я перайшоў у РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава і фактычна выконваў функцыі кіраўніка праекта па будаўніцтве цыклатронна-радыехімічнага комплексу ПЭТ-цэнтра.

Унікальная камбінацыя ведаў і практычнага досведу ў галіне хіміі лекаў і радыеактыўных рэчываў, назапашаныя на кафедры, дазволілі ўвесці ў эксплуатацыю першы ў краіне ПЭТ-цэнтр усяго за тры гады. Веды ў галіне ўзаемадзеяння нейтронаў і фатонаў з матэрыяламі спатрэбіліся пры праектаванні і абгрунтаванні сістэм радыяцыйнай абароны бункера цыклатрона. Для адпрацоўкі прамысловай тэхналогіі сінтэзу нанамалярных колькасцяў радыяфармпрэпаратаў прыйшлося вырашыць нямала складанасцяў, якія тычацца радыяхіміі, фармацэўтычнай хіміі, прамысловай асептыкі і тэхналогіі лекаў. І галоўнае, усе хімікі, якія працуюць на гэтай складанай вытворчасці, з'яўляюцца выпускнікамі кафедры радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій. Гэта 14 спецыялістаў, якія штодня забяспечваюць поўны цыкл вытворчасці, ад вылучэння нукліду і сінтэзу да гатовай лекавай формы, а таксама кантроль якасці прэпаратаў на аснове ультракароткажывучых нуклідаў F-18 і C-11.

За мінулыя 3 гады было выканана больш за 15000 ПЭТ/КТ дыягнастычных даследаванняў. Колькасць пацыентаў супастаўная з насельніцтвам раённага цэнтра. Супрацоўніцтва з кафедрай дазваляе разлічваць, што наша радыефармацэўтычная вытворчасць зможа і далей забяспечваць запатрабаванні Беларусі ў высокаадчувальнай дыягностыцы шырокага спектра анкалагічных, кардыялагічных і неўралагічных захворванняў метадам пазітронна-эмісійнай тамаграфіі.

Сяргей БЯЛЯЕЎ, дырэктар установы аховы здароўя «Нацыянальная антыдопінгавая лабараторыя»

Маё жыццё як хіміка пачалося ў далёкім 1996 годзе з моманту паступлення на хімічны факультэт БДУ. І літаральна з першага курса я пазнаёміўся з выкладчыкамі кафедры радыяцыйнай хіміі, якія вельмі арыгінальна і лёгка дзяліліся сваімі ведамі і досведам з намі, студэнтамі.

Шадыра Алег Іосіфавіч, Гергалаў Валерый Іванавіч, Касабуцкі Вячаслаў Станіслававіч, Полазаў Генрых Іванавіч і многія іншыя ставіліся да нас не проста як да студэнтаў, а як да асоб, што вельмі матывавала на тое, каб не падвесці іх на іспытах.

Я ўжо больш за 6 гадоў з'яўляюся дырэктарам установы аховы здароўя «Нацыянальная антыдопінгавая лабараторыя». Мая сувязь з кафедрай радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій не перарываецца. Мы актыўна ўдзельнічаем у навучальным працэсе і прадстаўляем магчымасці лабараторыі ў якасці базы для вытворчай практыкі. З вялікім задавальненнем прымаем да сябе на працу выпускнікоў кафедры. Іх заўсёды вылучаюць цвёрдыя тэарэтычныя веды хіміі і добрыя практычныя навыкі.

Усё гэта стала магчымым дзякуючы таму агеньчыку, які быў запалены больш за 20 гадоў таму Алегам Іосіфавічам Шадырам і яго паплечнікамі па кафедры радыяцыйнай хіміі.

Святлана ПРАДУН, начальнік аддзела біяаналітычных даследаванняў Нацыянальнай антыдопінгавай лабараторыі

Я вучылася на хімічным факультэце БДУ ў 2001–2006 гг. На чацвёртым курсе я прыйшла на кафедру радыяцыйнай хіміі, бо ведала, што тут неабходна будзе шмат працаваць, але наўзамен я атрымаю добры практычны досвед. Я бязмерна ўдзячная супрацоўнікам кафедры, якія навучылі мяне працаваць на вынік. Тут я атрымала ўсе навыкі, якія пазней з поспехам выкарыстоўвала ў сваёй працы. Мала хто з маіх аднакурснікаў мог пахваліцца ўменнем працы на высокаэфектыўных вадкасных і газавых храматографах. Каласальны практычны досвед стаў вельмі карысным падчас маіх першых прафесійных крокаў у Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі. На працягу двух гадоў працы ў акадэміі не раз даводзілася звяртацца па дапамогу да роднай кафедры – мне заўсёды ішлі насустрач.

З 2008 г. я працую ва ўстанове аховы здароўя «Нацыянальная антыдопінгавая лабараторыя», дзе прайшла шлях ад хіміка да начальніка аддзела біяаналітычных даследаванняў. Сёння наша лабараторыя з'яўляецца ўнікальнай базай выканання самых разнастайных аналітычных прац у галіне допінг-кантролю і фармацэўтычнага аналізу. У аддзеле біяаналітычных даследаванняў мы на завяршальным этапе распрацоўкі лекавага сродку – даследавання біяэквівалентнасці джэнерыка і арыгінальнага прэпарата. Кожны год мы з вялікай радасцю прымаем на практыку студэнтаў кафедры радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій. Мы дапамагаем у выкананні іх праектаў на ўсіх этапах, ад падрыхтоўкі посуду да апрацоўкі вынікаў храмата-мас-спектраметрычнага аналізу.

Шырокая навуковая, практычная і інавацыйная дзейнасць, сучасныя тэхналогіі, якія выкарыстоўвае кафедра, дазваляюць рыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў, канкурэнтаздольных на рынку працы.

Пётр ЛАГУЦІН, начальнік аддзела кантролю якасці ЗВУП «Мед-інтэрпласт»

Паступіў у 1997 г. на хімфак, пачаў з 3 курса займацца навуковай працай на кафедры радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі пад кіраўніцтвам дацэнта В. Л. Сарокіна. Тэматыкай працы з'яўляўся сінтэз і вывучэнне радыкалінгібітарнай актыўнасці вытворных дыз-трэт-бутыл-амінафенолу. Тым часам на кафедры пачаў фарміравацца калектыў захопленых навуковай працай студэнтаў, якія пасля працягнулі навуковую дзейнасць у аспірантуры пры кафедры, вывучаючы ўплыў фармакалагічна актыўных злучэнняў на радыяцыйна-індуцыраваныя свабоднарадыкальныя ператварэнні біялагічна важных рэчываў і злучэнняў, якія іх мадэлююць. Скончыўшы ў 2002 г. універсітэт, я пасля прапановы праф. А. І. Шадыры, які стаў маім навуковым кіраўніком, паступіў у аспірантуру. За 3 гады, дзякуючы добрай матэрыяльна-тэхнічнай базе кафедры, мне ўдалося ў поўным аб'ёме выканаць практычную частку кандыдацкай дысертацыі, прысвечаную радыкалінгібітарнай актыўнасці вітамінаў групы В у дачыненні да вугляродцэнтраваных радыкалаў. Да таго моманту пачаў актыўна развівацца недзяржаўны кластар фармацэўтычнай прамысловасці РБ. Пачынаючы з 2005 г., паспяхова працаваў і працую на такіх фармпрадпрыемствах, як НВЗАТ «Малкут», СТАА «Лекфарм», ЗВУП «Мед-інтэрпласт». Хочацца адзначыць, што веды і практычны досвед, атрыманыя падчас навуковай дзейнасці пры кафедры зараз ужо радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій, дазволілі лёгка перайсці ад фундаментальных даследаванняў да практычнай працы ў фармацэўтычнай індустрыі.

Канстанцін ФРАЛЯНКОЎ, намеснік генеральнага дырэктара СТАА «НатыВіта»

Паступаючы ў 2002 г. у БДУ, я паехаў на дзень адчыненых дзвярэй на кафедру радыяцыйнай хіміі і абраў фармацэўтычны кірунак. Для зялёнага выпускніка гімназіі аповеды пра распрацоўку новых лекавых сродкаў, свабоднарадыкальныя працэсы ў арганізме, іх уплыў на арганізм былі як палёт у космас. Тым больш што такія прыклады я сустракаў толькі ў замежнай літаратуры.

Гэта паездка зняла ўсе пытанні выбару «кім быць».

Першыя два гады студэнты прыглядаюцца да спецыялізацый. Варыянтаў – велізарнае мноства. Тут і аналітычная хімія, і арганічная, і фізічная з калоіднай.

Магу шчыра сказаць, кафедра радыяцыйнай хіміі – гэта скрыжаванне ўсіх «хімій». Гэтым і зацікавіла. Не хацелася мне выбіраць штосьці адно, а хацелася ўсё і адразу. І тут ёсць усё, што трэба:

1. Разуменне працэсаў у жывых аб'ектах – біяхімія
2. Пошук рэчываў, якія ўплываюць на акісляльна-аднаўленчыя працэсы – медыцынская хімія
3. Пошук спосабаў сінтэзу рэчываў – арганічная хімія
4. Пошук механізмаў іх дзеяння – фізічная хімія
5. Ацэнка таксікалагічных уласцівасцяў – фармакалогія
6. Характарызаванне рэчываў – аналітычная хімія.

Узроўню абсталяванасці лабараторый кафедры пазайздросцяць многія. Тут і сучасныя храматографы, і мас-дэтэктары, і рэактывы. Але самае галоўнае – людзі, пачынаючы з загадчыка кафедры А. І. Шадыры і заканчваючы лабарантамі. Яны вучаць аднаму вельмі складанаму прынцыпу: паглыбляючыся ў прыватнасці працэсу, не забываць пра галоўнае: усё ўзаемазвязана. Вырашаць задачы комплексна. Рабіць высновы толькі на падставе фактаў. Не выпускаць з поля зроку нічога, крытычна падыходзіць да ацэнкі выніку.

Менавіта гэтыя навыкі дазваляюць дамагацца поспехаў і робяць са студэнта спецыяліста, а са спецыяліста – кіраўніка. Менавіта гэтыя якасці дазваляюць займацца адказнымі задачамі, такімі як распрацоўка і вытворчасць лекавых сродкаў.

Дзяніс ЯНОВІЧ, дырэктар ТАА «Кампілаб», дыстрыб'ютар навуковага і аналітычнага абсталявання Agilent Technologies, выпускнік 2001 г.

На хімфаку студэнты да 4 курса паспявалі папрацаваць практычна на ўсіх кафедрах і «акунуцца» ва ўсе віды хіміі. Мяне прыцягнула лабараторыя біяхіміі лекавых прэпаратаў НДІ ФХП БДУ пад кіраўніцтвам прафесара У. М. Шкуматава. На яе базе праводзіліся заняткі студэнтаў кафедры радыяцыйнай хіміі. Лабараторныя працы па біяхіміі давалі магчымасць студэнту папрацаваць на рэдкіх у той час вадкасных храматографах, выконваць гель-электрафарэз бялкоў, вымяраць канцэнтрацыю бялкоў і хуткасць ферментатыўных рэакцый на цалкам аўтаматычным дарагім замежным спектрафатометры (што вельмі моцна кантраставала з СФ-26 ці КФК-2). Атрыманыя мной досвед і веды вось ужо 20 гадоў дазваляюць быць у прафесіі.

Два гады працы ў лабараторыі і на кафедры сталі перыядам прадуктыўнага прафесійнага прыросту. Далейшая вучоба ў аспірантуры, праца ў Акадэміі навук, а затым і ў камерцыйных структурах паказала, што атрыманыя веды актуальныя, яны дазваляюць працаваць і зарабляць. Мне не прыйшлося перавучвацца!

Цяпер я выдатна разумею, што «прыгожыя» лабараторыі, сучаснае абсталяванне, насычаныя лабараторныя працы для студэнтаў – гэта цяжкая самаадданая праца ўсіх супрацоўнікаў кафедры. Стварэнне і падтрыманне інфраструктуры навуковай адукацыі, здабыванне рэактываў і расходных матэрыялаў для студэнцкіх прац, навуковае і матэрыяльнае забеспячэнне іх дыпломных даследаванняў – гэта неацэннае інвеставанне ў новыя пакаленні хімікаў. Цяпер, калі мне самому даводзіцца наймаць супрацоўнікаў, наяўнасць у кандыдата дыплома выпускніка хімічнага факультэта – дадатковы плюс і знак якасці. У нашай кампаніі палова супрацоўнікаў – выпускнікі хімфака, а двое – выпускнікі кафедры радыяцыйнай хіміі.

У 2016 г. наша кампанія падарыла хімічнаму факультэту навучальны клас з вадкасным і газавым храматографамі і атамна-эмісійным спектрометрам. Гэтыя прыборы выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе. Але ніякі прыбор не заменіць Настаўніка.

Юлія БЯЛКОЎСКАЯ, начальнік аддзела распрацоўкі і ўкаранення тэхналогій фармацэўтычных субстанцый кіравання інавацыйнага развіцця РУП «Белмедпрэпараты»

Я скончыла хімічны факультэт БДУ па спецыяльнасці «Хімія лекавых злучэнняў» у 2000 г. і распачала працу ў РУП «Белмедпрэпараты» ў якасці біяхіміка. У 2014 г. узначаліла аддзел распрацоўкі і ўкаранення тэхналогій фармацэўтычных субстанцый кіравання інавацыйнага развіцця.

У наш час на прадпрыемстве працуе каля 20 супрацоўнікаў – выпускнікоў кафедры радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій па спецыяльнасцях «Хімія (фармацэўтычная дзейнасць)» і «Хімія лекавых злучэнняў». Кожны год у розных лабараторыях РУП «Белмедпрэпараты» праходзяць вытворчую і перадпыпломную практыкі, а таксама выконваюць дыпломныя працы 2–4 студэнты кафедры, частка з іх у далейшым застаецца працаваць па размеркаванні.

У рамках навукова-інавацыйнага супрацоўніцтва сумесна з супрацоўнікамі кафедры распрацаваны і ўкаранёныя ў вытворчасць арыгінальныя супрацьвірусныя лекавыя сродкі «Бутамінафен» і «Актавір», вельмі эфектыўныя пры лячэнні герпетычных інфекцый.

Хочацца адзначыць высокі ўзровень падрыхтоўкі студэнтаў хімічнага факультэта і выказаць падзяку загадчыку кафедры радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій А. І. Шадыру і супрацоўнікам, якія ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы студэнтаў па такіх унікальных і важных для нашай краіны спецыяльнасцях.

Юрый ЦЕЛЕГАЎ, вядучы інжынер-тэхнолаг хімічнага цэха РУП «Беларуская атамная электрастанцыя»

Яшчэ пры паступленні ў БДУ я ставіў за мэту працаваць на атамнай станцыі, таму пры выбары кірунку не вагаўся. Дзякуючы дзяржаўнай праграме падрыхтоўкі маладых спецыялістаў для атамнай станцыі факультэт праводзіў выязныя курсы навучання і павышэння кваліфікацыі па тэматыцы «Хімія ў атамнай энергетыцы, радыяцыйная бяспека». Гэта дапамагло атрымаць больш падрабязнае ўяўленне пра атамную энергетыку, што яшчэ больш падмацавала маё жаданне быць часткай першай АЭС у Беларусі.

Хачу выказаць велізарную падзяку выкладчыкам факультэта за іх навучанне і дапамогу. Жадаю вам далейшага паспяховага развіцця атамнага кірунку і поспехаў у навуковых распачынаннях.



Аляксандра ЛІСОЎСКАЯ, выпускніца кафедры 2008 г.

Дзякуючы курсу лекцый «Свабодныя радыкалы ў хіміі, біялогіі і медыцыне» прафесара А. І. Шадыры, мяне зацікавіла сувязь розных дысцыплін пры вывучэнні свабоднарадыкальных працэсаў і іх значнасць для жывога арганізма.

Падчас падрыхтоўкі дысертацыі былі адкрыты новыя рэакцыі распаду сфінгаліпідаў пры ўздзеянні на іх радыкальных агентаў і УФ-выпраменьвання. Гэта дазволіла выявіць новыя мішэні пры актывацыі свабоднарадыкальных працэсаў у арганізме. Я авалодала тэхнікай выканання радыяцыйна– і фотахімічнага эксперыменту, фізіка-хімічных метадаў аналізу з выкарыстаннем сучаснага аналітычнага абсталявання. Вынікі працы былі апублікаваны ў міжнародных выданнях і дакладваліся на міжнародных канферэнцыях, дзякуючы чаму змагла атрымаць гранты на навуковыя паездкі ў Грэцыю, Францыю, Германію, Турцыю, ЗША.

Працягнула сваю навуковую дзейнасць у лабараторыі хіміі свабоднарадыкальных працэсаў НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ. У 2016 г. атрымала стыпендыю Сусветнай федэрацыі навукоўцаў. А ў 2017 г. мне прысудзілі стыпендыю DAAD для працы ў Германіі, у рамках якой я выконвала даследаванні з выкарыстаннем метадаў электроннага парамагнітнага рэзанансу ва Універсітэце Бона. Я заўсёды марыла працаваць на такім абсталяванні, яно дазваляе зафіксаваць кароткажывучыя радыкальныя часціцы і, адпаведна, даказаць тэорыі, якія мы дапускаем у нашых даследаваннях.

Досвед працы на кафедры ў галіне радыяцыйнай хіміі і фотахіміі дапамог мне атрымаць месца запрошанага навукоўца ў радыяцыйнай лабараторыі Універсітэта Нотр-Дам у ЗША.

Я папрацавала ў Германіі і ў амерыканскай лабараторыі і магу з упэўненасцю казаць, што нягледзячы на розны ўзровень фінансавай падтрымкі, у нас ва ўніверсітэце добрая падрыхтоўка студэнтаў.

Пётр ЛАГУЦІН, начальнік аддзела кантролю якасці ЗВУП «Мед-інтэрпласт»

Паступіў у 1997 г. на хімфак, пачаў з 3 курса займацца навуковай працай на кафедры радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі пад кіраўніцтвам дацэнта В. Л. Сарокіна. Тэматыкай працы з'яўляўся сінтэз і вывучэнне радыкалінгібітарнай актыўнасці вытворных дыз-трэт-бутыл-амінафенолу. Тым часам на кафедры пачаў фарміравацца калектыў захопленых навуковай працай студэнтаў, якія пасля працягнулі навуковую дзейнасць у аспірантуры пры кафедры, вывучаючы ўплыў фармакалагічна актыўных злучэнняў на радыяцыйна-індуцыраваныя свабоднарадыкальныя ператварэнні біялагічна важных рэчываў і злучэнняў, якія іх мадэлююць. Скончыўшы ў 2002 г. універсітэт, я пасля прапановы праф. А. І. Шадыры, які стаў маім навуковым кіраўніком, паступіў у аспірантуру. За 3 гады, дзякуючы добрай матэрыяльна-тэхнічнай базе кафедры, мне ўдалося ў поўным аб'ёме выканаць практычную частку кандыдацкай дысертацыі, прысвечаную радыкалінгібітарнай актыўнасці вітамінаў групы В у дачыненні да вугляродцэнтраваных радыкалаў. Да таго моманту пачаў актыўна развівацца недзяржаўны кластар фармацэўтычнай прамысловасці РБ. Пачынаючы з 2005 г., паспяхова працаваў і працую на такіх фармпрадпрыемствах, як НВЗАТ «Малкут», СТАА «Лекфарм», ЗВУП «Мед-інтэрпласт». Хочацца адзначыць, што веды і практычны досвед, атрыманыя падчас навуковай дзейнасці пры кафедры зараз ужо радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій, дазволілі лёгка перайсці ад фундаментальных даследаванняў да практычнай працы ў фармацэўтычнай індустрыі.

Дзякуй вам, Настаўнікі! Дзякуй, кафедра!

УНІВЕРСІТЭТ
7 снежня 2018 года, № 17 (2205)

«Ідэальны выкладчык – той, хто ведае, як тэорыя працуе на практыцы»

Сёння праект «Новы погляд» распавядзе пра загадчыцу кафедры міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права Алену БАБКІНУ. Яе навуковае званне – дацэнт. Спецыяльнасць кафедры лідзіруе ў рэйтынгу прахадных балаў у краіне. З ёй пагаварылі пра прафесійныя сакрэты, асаблівасці арганізацыі працы на кафедры – пра трэніровачныя суды, дысцыпліны на англійскай мове, дыстанцыйную магістратуру. А таксама пра тое, як зрабіць навучанне яшчэ лепшым.

Алена Бабкіна і студэнты А. Шантора, Т. Пацапня і А. Сялюн на конкурсе па праве ЕАЭС и Расійскай акадэміі правасуддзя ў Маскве

Спалучаць выкладанне з практыкай

Алена Бабкіна студэнцкія гады правяла на кафедры міжнароднага права на юрыдычным факультэце, тут жа вучылася ў аспірантуры. У 2000 г. з кафедры міжнароднага права, якая ўжо знаходзілася на факультэце міжнародных адносін, была вылучана кафедра міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права. З гэтага часу Алена Бабкіна засталася працаваць ва ўніверсітэце. Пасля пару гадоў абараніла дысертацыю, атрымала званне дацэнта.

Паралельна з выкладчыцкай дзейнасцю займалася практыкай, працавала ў Эканамічным судзе СНД, у Судзе Еўразійскай эканамічнай супольнасці і Судзе Еўразійскага эканамічнага саюза. І сёння з'яўляецца арбітрам Міжнароднага арбітражнага суда пры Беларускай гандлёва-прамысловай палаце, прызначана ад Беларусі арбітрам Міжнароднага цэнтра па ўрэгуляванні інвестыцыйных спрэчак, які размяшчаецца ў Вашынгтоне.

– У маім разуменні ідэальны выкладчык – гэта той, хто ведае тэорыю і разумее, як яна працуе на практыцы, – лічыць Алена Васільеўна. – Толькі тады ты становішся тым спецыялістам, які можа даць студэнту максімум па сваім прадмеце. Безумоўна, патрэбныя стажыроўкі за мяжой па нашым навуковым кірунку. У свой час я стажыравалася ў Галандыі ў Акадэміі міжнароднага права і ў Інстытуце ASSER, у Інстытуце Макса Планка ў Германіі, Міжнародным інстытуце ўніфікацыі прыватнага права ў Італіі.

Алена Васільеўна ўпершыню ўзначаліла кафедру яшчэ 10 гадоў назад. У 2012 годзе сышла са штата ўніверсітэта працаваць у суд. Амаль 6 гадоў працавала ў БДУ на грамадскіх пачатках. Сёлета ў верасні вярнулася на пасаду і ўзялася за напісанне доктарскай дысертацыі.

Вышэйшая матэматыка ў юрыспрудэнцыі

Алена Васільеўна з сям'і ўрачоў, але яшчэ ў малодшых класах вырашыла, што не пойдзе па бацькоўскіх слядах, а стане юрыстам. Студэнткай, на лекцыях прафесара Людмілы Васільеўны Паўлавай, зразумела, што ёй цікава ў далейшым паглыблена вывучаць міжнароднае права.

Загадчыца кафедры займаецца праблематыкай міжнароднага прыватнага права (МПП). Гэта комплексная сістэма разглядае пытанне вызначэння права, якое будзе прымяняцца, калі сутыкаецца некалькі нацыянальных сістэм. Напрыклад, права якой дзяржавы павінна рэгуляваць здзелкі з замежнікамі і іншае.

– МПП завуць вышэйшай матэматыкай юрыспрудэнцыі, – адзначае яна. – Тут вельмі шмат сэнсу звязана – цывілістыка, сямейнае, міжнароднае публічнае права, еўрапейскае, банкаўскае права і іншыя галіны. Гэта складаныя прававыя пытанні, якія патрабуюць комплекснага падыходу. У выніку на кафедру звяртаюцца з запытамі пра тое, як тыя ці іншыя адносіны павінны быць урэгуляваны з навукоўца пункта гледжання.

Таксама яна кіруе студэнцкім клубам Group of Private International Law Development. Тут удзельнікі рыхтуюць даклады, параўноўваюць беларускае заканадаўства пра МПП з замежнымі нарматыўнымі прававымі актамі, аналізуюць магчымасці, якія вынікаюць з членства Беларусі ў міжнародных арганізацыях. Юрысты-практыкі выступаюць з семінарамі па пытаннях прававога рэгулявання, напрыклад, прыватнаправавых аспектах даследавання космасу, асабліваcцях ужывання смарт-кантрактаў і крыптавалют.

Сёлета яна пачала выкладаць дысцыпліну «Еўрапейскае міжнароднае прыватнае права» на англійскай мове. Выкладанне на замежнай мове на кафедры не рэдкасць – у рамках навучання на бакалаўрыяце і ў магістратуры пяць дысцыплін чытаюцца на замежнай мове. Часам для чытання лекцый прыцягваецца visitor professor з-за мяжы. Як адзначае загадчыца, у студэнтаў факультэта добры ўзровень веданя мовы, яны прыходзяць вучыцца ўжо з пэўнай базай, бо паступіць на ФМА не так лёгка. Па яе словах, послехі студэнтаў натхняюць на далейшую працу. Найлепшая ўзнагарода для выкладчыка – бачыць развіццё сваіх вучняў і іх жаданне вучыцца.

Прыярытэты кафедры

Калектыў кафедры складаюць 20 выкладчыкаў, уключаючы сумяшчальнікаў. Яны дапамагаюць студэнтам засвоіць грамадзянскае, міжнароднае прыватнае, сямейнае, еўрапейскае, міжнароднае медыцынскае, банкаўскае, міжнароднае інвестыцыйнае права, грамадзянскі і гаспадарчы працэс і іншыя прадметы.

– Гэта кола дысцыплін, якое дазваляе падрыхтаваць спецыяліста, які зможа забяспечваць прававое суправаджэнне знешнеэканамічнай дзейнасці юрыдычнай асобы, – робіць акцэнт Алена Васільеўна. – Некаторыя дысцыпліны выкладаюць юрысты-практыкі, бо практыка-арыентаванасць – гэта прыярытэт кафедры.

Навучальная літаратура – «залаты запас» кафедры. Тут быў нядаўна выдадзены навучальны дапаможнік па еўрапейскім праве, таксама падрыхтаваны да выдання першы ў Беларусі калектыўны падручнік па агульнай частцы міжнароднага прыватнага права. Абодва з грыфам Міністэрства адукацыі Беларусі. Апошні выкладчыкі рыхтавалі на працягу многіх гадоў, некалькі разоў тэкст дапаможніка актуалізаваўся з прычыны змены заканадаўства і з'яўлення міжнародна-прававых трэндаў. У хуткім часе пачне камплектавацца матэрыял для другога і трэцяга тома падручніка па міжнародным прыватным праве. Раней убачылі свет навучальныя дапаможнікі па міжнародным банкаўскім праве (аўтар – старшы выкладчык Н. Ю. Газдзюк) і навучальны дапаможнік па праве інтэлектуальнай уласнасці (аўтар – дацэнт А. Б. Леановіч).

Кафедра выпускаючая, рыхтуе студэнтаў спецыяльнасці «Міжнароднае права» па дзвюх з трох спецыялізацый: «Міжнароднае прыватнае права» і «Еўрапейскае права». Варта вылучыць, што апошнія гады названая спецыяльнасць у лідарах у рэйтынгу прахадных балаў у краіне. Вучыцца тут цікава, але не проста. Аднак студэнты вытрымліваюць высокія патрабаванні, якія прад'яўляюцца да навучання юрыстаў-міжнароднікаў.

– Аднак калі ты паспяховы ў вучобе і знаходзішся ў топе рэйтынгу, то з працаўладкаваннем цяжкасцяў не ўзнікае. Нашы выпускнікі размяркоўваюцца ў дзяржаўныя органы: міністэрствы юстыцыі, замежных спраў, Нацыянальны цэнтр

Нядаўна на кафедры падрыхтавалі да выдання першы ў краіне калектыўны падручнік па агульнай частцы міжнароднага прыватнага права

заканадаўства і прававых даследаванняў, а таксама міжнародныя арганізацыі: Прадстаўніцтва ААН, Эканамічны суд СНД, Суд Еўразійскага эканамічнага саюза, – каментуе загадчыца кафедры. – Таксама гэта буйныя юрыдычныя фірмы. Ад выпускніка прыходзяць падзячныя лісты за атрыманую адукацыю, якая, па іх меркаванні, не горшая, чым у іншых краінах. Прыемны факт запатрабаванасці: нашы выпускнікі нават на ўмовах цвёрдай канкурэнцыі ў прафесіі знаходзяць добрыя працоўныя месцы. Значыць, усе мы – выкладчыкі кафедры – робім добрую і патрэбную справу.

Погляд на навучанне

– Мы развіваемся па шляху практыка-арыентаванасці, – кажа загадчыца кафедры. – Мы даём усе магчымасці для таго, каб выпускнік выдатна арыентаваўся на працоўным месцы. Нашы студэнты ўдзельнічаюць у конкурсах, якія дапамагаюць ім праверыць свае навыкі ў канкрэтных сітуацыях.

Спецыфіка навучання на ФМА – падрыхтоўка каманд для ўдзелу ў міжнародных moot-court, ці так званых трэніровачных судах. Гэта інсцэніроўка судовых працэсаў у міжнародных судах ці міжнародных камерцыйных арбітражах па розных кірунках. Ствараецца фабула справы, студэнты прадстаўляюць розныя бакі працэсу. Часта выпускнікі, якія раней удзельнічалі ў конкурсах, зараз самі трэніруюць каманды.

– Хачу падзякаваць настаўнікам, якія гатовыя выдаткоўваць асабісты час на падрыхтоўку студэнцкіх каманд. Гэта выдатны трэнінг для студэнтаў, – распавядае Алена Васільеўна. – Яны бачаць, як працуе суд, як рыхтуюцца прававыя пазіцыі, разумеюць, што кожную справу трэба разглядаць пад розным вуглом. Апроч гэтага, часта выступленні праходзяць на замежнай мове, што становіцца добрай практыкай у мове спецыяльнасці, а таксама ў прамоўніцкім майстэрстве. «Мут корты» – гэта выклік, запыт асобаснага росту, атрыманне навыкаў працы ў камандзе, адказнасць. Сёлета мы з дапамогай «ветэранаў мутаўскага руху» зрабілі «Алею славы» – фатаграфіі ўдзелу нашых студэнтаў у розныя гады ў розных конкурсах. Будзем пашыраць гэту алею новымі поспехамі.

Так, нядаўна каманда (студэнты А. Шантора, Т. Пацапня, А. Сялюн), якую рыхтавала Алена Васільеўна, на конкурсе па праве ЕАЭС у Расійскай акадэміі правасуддзя ў Маскве атрымала годныя ўзнагароды. «Справа пра вецер»: інсцэніроўка працэсу ў Судзе Еўразійскага эканамічнага саюза пра парушэнне дзяржавай умоў дамовы пастаўкі ветранай энергіі і права Саюза. Каманда факультэта стала віцэ-чэмпіёнам і атрымала званне найлепшага аратара фіналу конкурсу. Віншуем!

Акрамя гэтага на кафедры ўдасканальваецца магістратура. Летась распрацаваны новы двухгадовы навучальны план. Да таго ж у гэтым навучальным годзе падрыхтаваны план англамоўнай магістратуры, яна будзе арыентавана на замежнага спажыўца.

– Мы паспрабуем зрабіць яе дыстанцыйнай, бо на сёння гэта запатрабаваны метад навучання. У планах – стварэнне каля 15-20 дысцыплін, для кожнай неабходна падрыхтаваць якасную абалонку, – працягвае яна.

Як разважае Алена Бабкіна, усе веды, якія дае ўніверсітэт, неабходныя для жыцця і прафесіі:

– Мая парада – вучыцца, вырашаць задачы, якія ставяць выкладчыкі, выкарыстоўваць дадатковыя рэсурсы, каб глыбей пагрузіцца ў тыя пытанні, якія цікавяць.

Алена ЛЯЎШЭНЯ

Заалогія і канстытуцыйнае права

Вызначаны найлепшыя навуковыя гурткі БДУ

Універсітэт аб'ядноўвае ў навуковых гуртках 2,5 тысячы студэнтаў. Такіх аб'яднанняў па навуковых інтарэсах ажно 125! Якія ж з іх найбольш поўна раскрываюць інтэлектуальны і творчы патэнцыял студэнтаў? Іх вызначылі падчас конкурсу «Найлепшы навуковы гурток БДУ». Узнагароджанне пераможцаў адбылося 26 лістапада.

Конкурс накіраваны на развіццё інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу адоранай моладзі, стымуляванне настаўніцкай дзейнасці, павышэнне якасці вышэйшай адукацыі, удасканаленне сістэмы падрыхтоўкі навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі, садзейнічанне прасоўванню навуковых ідэй, гіпотэз і інавацый студэнтаў, магістрантаў.

Па ўмовах конкурсу трэба было падрыхтаваць відэаролік пра дзейнасць навуковага гуртка. Камісія ацэньвала педагагічныя прыёмы і метады стымулявання пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў, найважнейшыя навуковыя дасягненні і ідэі гуртка, гіпотэзы, інавацыі студэнтаў. Пераможцамі сталі гурткі юрыдычнага і біялагічнага факультэтаў.

Спецыялісты канстытуцыйнага права

У намінацыі «Найлепшы гурток БДУ ў галіне гуманітарных навук» лідарам стаў гурток па канстытуцыйным праве кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта. Кіраўнікі навуковага гуртка – доктар юрыдычных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі, загадчык кафедры канстытуцыйнага права **Рыгор Васілевіч** і дацэнт кафедры **Таццяна Маслоўская.**

Гурток працуе больш за 15 гадоў – з 2002 года. Асноўная яго мэта – навучанне студэнтаў самастойнаму паглыбленаму вывучэнню тэорыі і практыкі канстытуцыйнага права. «Мы імкнёмся прышчапляць практычныя навыкі, тэорыю суправаджаем прыкладамі з практыкі», – пераконвае Таццяна Маслоўская.

На сустрэчах студэнты абмяркоўваюць і дыскутуюць на тэмы, актуальныя для развіцця беларускай нацыянальнай прававой сістэмы. Праводзяцца відэаканферэнцыі з замежнымі ВНУ, нядаўна яе правялі з Далянскім політэхнічным універсітэтам (Кітай).

Гурток рэгулярна ладзіць выязныя пасяджэнні ў Савеце Рэспублікі, Палаце прадстаўнікоў, іншых дзяржаўных органах. Запрашае айчынных і замежных экспертаў. «Выкарыстоўваючы гэтыя формы працы, паглыблена вывучаем праблемы канстытуцыйнага права, правапрымяняльнай практыкі. Выяўляем і матывуем адораных студэнтаў, якія схільныя да навуковай дзейнасці, навучаем навыкам вядзення навуковых дыскусій», – удакладняе Таццяна Маслоўская.

«Удзел у гэтым гуртку дапамагае студэнтам юрыдычнага факультэта развіваць свой далягляд, спазнаваць існыя праблемы і знаходзіць шляхі іх рашэння. Многія са студэнтаў потым займаюцца навуковай дзейнасцю, становяцца добрымі выкладчыкамі і навукоўцамі», – лічыць прафесар Рыгор Васілевіч.

Артур Касцюшка, стараста гуртка, студэнт 3 курса: «Мы праводзім дыскусіі па адвольных тэмах канстытуцыйнага права як у рамках факультэта, так і міжнароднага фармату праз скайп. Ходзім на экскурсіі ў дзяржаўныя органы, лекцыі. Я займаюся гэтым з-за цікавасці да пытанняў функцыянавання дзяржавы і грамадства. Гэта прыйшло з маёй любові да імперый мінулага: мне цікава зразумець, як яны працавалі. І, вядома, гэта пошук аднадумцаў».

Віктар Сухапараў, магістрант: «Канстытуцыйнае права палюбілася яшчэ з першага курса, бо гэта ўнікальная галіна права, якая змяшчае як міжнародна-прававыя стандарты, так і публічныя і прыватныя пачаткі нацыянальнай прававой сістэмы. Гурток па канстытуцыйным праве з'яўляецца полем для навукова-практычных дыскусій і збірае зацікаўленых навуковых супрацоўнікаў, а таксама студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў. На пасяджэннях адбываецца прадуктыўнае ўзаемадзеянне мудрых настаўнікаў і дапытлівага маладога пакалення ў сяброўскай атмасферы. Магчыма, у гэтым і ўвесь сакрэт таго, чаму туды хочацца хадзіць увесь час, працуючы ў сваё задавальненне».

Стогадовая гісторыя і прамоўніцкае майстэрства

У намінацыі «Найлепшы навуковы гурток БДУ ў галіне прыродазнаўчых навук» перамог гурток кафедры заалогіі біялагічнага факультэта.

Гурток з'явіўся разам з біялагічным факультэтам – у 1923 годзе, узначаліў яго Анатоль Фядзюшын. З 2016 года гуртком кіруе старшы выкладчык кафедры заалогіі **Алег Сінчук**. Асноўная мэта гуртка – аб'ядноўваць па інтарэсах. «Я імкнуся запрашаць тых студэнтаў, якія ў перспектыве прыйдуць да нас на кафедру ці будуць працаваць у студэнцкай навуковай лабараторыі. Праводжу шмат пасяджэнняў, пакольк мне ёсць чым падзяліцца і што распавесці», – кажа кіраўнік.

Сапраўды, выкладчык вучыўся ў Францыі, вывучаў акіянаграфію і статыстыку на высокім узроўні. Ва ўніверсітэце ён працягвае міжнароднае супрацоўніцтва: летась у гуртку выступалі спецыялісты з Латвіі і Польшчы. Цяпер запрашэнні госці – некамерцыйныя экалагічныя арганізацыі з навукова-папулярнай тэматыкай. «Я шукаю стажыроўкі для студэнтаў, імкнуся прывесці існуючыя магчымасці праз гурток. Некаторыя студэнты працуюць у паляўнічых гаспадарках, сочаць за анлайн-камерамі», – кажа Алег Сінчук.

Пасяджэнні гуртковў – адкрытыя і закрытыя. На першыя прыходзяць усе аховікі, яны анансуюцца ва «Укантакце» і прысвечаны займальным тэмам, звязаным з заалогіяй. На закрытых пасяджэннях студэнты вучацца афармляць навуковыя публікацыі, аналізаваць дадзеныя, разглядаюць частыя памылкі. «Мы вучымся прадстаўляць дадзеныя так, каб было зразумела неспецыялісту ў гэтай тэме. Пасля далей навука рухаецца, тым складаней успрымаць чалавеку, які не ў тэме – занадта шмат вузкіх кірункаў. І, вядома, мы вывучаем прамоўніцкае майстэрства: як трымацца на сцэне, як гаварыць і будаваць аповед», – каментуе кіраўнік гуртка.

Студэнты прыходзяць у першай палове года дзякуючы працы кураторскіх груп, ёсць у гуртку і праца са школьнікамі, на кансультацыю звяртаюцца нават абласныя школы. У планах – стварэнне YouTube-канала, дзе за 3-4 хвіліны можна будзе даведацца, пра што было пасяджэнне, і кратка зразумець яго тэму.

Анастасія Кучвальская, магістрантка: «Якія ёсць на факультэце навуковыя гурткі, мяне зацікавіла яшчэ на першым курсе. Бо ўжо на другім трэба было абраць кафедру, дзе неабходна будзе напісаць шэраг курсавых прац і дыпломны праект. Да выбару я падышла грунтоўна. Наведванне пасяджэнняў гуртка дазволіла вызначыць маю цікавасць да заалогіі. На пасяджэннях я даведалася шмат новага пра насякомых-шкоднікаў, пра загадкавых жывёл, якія патрапілі да нас з іншых краін, пра краявіднае багацце пчол. Падчас летняй практыкі ўсё склалася канчаткова: я яшчэ больш пераканалася ў тым, што вывучэнне жывёл – гэта маё.

Аб'ектам маёй навуковай цікавасці стаў маленькі матылёк – таполевая моль-стракатка. Цяпер я вучуся ў магістратуры, і мая цікавасць да насякомых не знікла. Наадварот, узмацнілася! Сапраўды, дзівосны свет хаваецца ў нас пад нагамі! Адной з прычын поспеху гуртка, на мой погляд, з'яўляецца камандная праца. Немагчыма быць у некалькіх месцах адначасова. Але навыка патрабуе ўсё і нават больш, таму мы адзін аднаму дапамагаем. Напрыклад, сабрась матэрыял і апрацаваць. І ўсё гэта мы можам даведацца на пасяджэннях гуртка, прысвечаных працы з навуковай інфармацыяй.

Мне здаецца, гэта адзін з нашых сакрэтаў, якім хочацца з вамі падзяліцца. А яшчэ наш кіраўнік Алег Віктаравіч – вялікі працаголік і захоплены сваёй працай чалавек. Гэта найлепшы прыклад для перайманння, я лічу».

Раман Шулінскі, студэнт: «На кафедры заалогіі і гуртку я з першага курса, імкнуся наведваць усе пасяджэнні. У гуртку выступаюць цікавыя спецыялісты, ёсць займальныя кірункі па біяразнастайнасці. Маёй галоўнай цікавасцю стала біяінфарматыка, таму я пайшоў у СНДЛ біяінфарматыкі і малекулярнай эвалюцыі жывёл, дзе актыўна працую да сёння».

Абодва гурткі захапляюць сваёй плённай працай і апантанасцю справай – выдатны прыклад моладзевай навуковай супольнасці ў БДУ.

Надзея МАРХЕЛЬ

УНІВЕРСІТЭТ
7 снежня 2018 года, № 17 (2205)

Фотакалаж Валерыя БАГДАРЧЫК

Растопім лёд разам!

На каньках і з клюшкамі адзначылі Дзень студэнта ў БДУ

У гонар Міжнароднага дня студэнта 17 лістапада прафсаюзная арганізацыя зноў сабрала студэнтаў БДУ на катку, каб зрабіць гэты дзень сапраўды незабыўным. Імпрэза да Міжнароднага дня студэнта на лёдзе ўжо стала штогадовай традыцыяй студэнтаў галоўнай ВНУ краіны. І на гэты раз у атмасферу свята ўсе пагрузіліся на пляцоўцы «Мінск-Арэны».

З віншавальнымі словамі для студэнтаў выступілі рэктар БДУ **Андрэй Кароль** і старшыня прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў **Вольга Локцева**. Прагучалі віншаванні ад беларускіх і замежных студэнтаў з Ірана, Туркменістана, Мазамбіка, Кітая. Парадавала спецыяльна падрыхтаванае прафсаюзным актывам факультэта міжнародных адносін БДУ online-віншаванне ад замежных студэнтаў з Германіі, Іспаніі, Азербайджана, Кітая і Анголы. Прайшла ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання найлепшых студэнтаў – прафсаюзных актывістаў: падзячнымі лістамі і памятнымі падарункамі былі ўзнагароджаны **Вераніка Грэсь** – студэнтка 4 курса юрыдычнага факультэта, **Ганна Блізнюк** – студэнтка 4 курса гістарычнага факультэта, **Аляксандра Цяцеркіна** – студэнтка 4 курса геаграфічнага факультэта, **Аліна Берднік** – студэнтка 3 курса філалагічнага факультэта.

Зачаравальныя падтрымкі і віртуозныя кручэнні на лёдзе прафесійных фігурыстаў Нацыянальнай зборнай Рэспублікі Беларусь па фігурным катанні на каньках не пакінулі абыякавым нікога. Перад публікай выступілі **Аліна Супоненка** – студэнтка 2 курса фізічнага факультэта з лірычнай кампазіцыяй, **Якаў Зянько**, **Карына Сідарэнка** і **Максім Яленіч** з кампазіцыяй «Вальс і танга «Вайна і мір».

Яшчэ адной неспадзеўкай для студэнтаў стаў майстар-клас ад спецыяльных гасцей святочнай акцыі – спартсменаў Мінскай СДЮШАР БФСГ «Дынама»: Паўла Асоўскага, Генадзя Колесава, Ілыі Жура і Уладзіслава Шэлеста. Усе атрымалі велізарнае задавальненне ад паказальных выступленняў хакеістаў і зарадзіліся станоўчымі эмоцыямі на ўвесь вечар ад каманды чароўных дзяўчат па чэрлідынгу Phoenix cheer team спартыўнага клуба чэрлідынгу Phoenix.

Артысты эстрады БДУ падрыхтавалі свае запальныя музычныя нумары. Перад студэнтамі выступілі **Alen Hit**, **Валерыя Несміян**, **Іван Мурзін**, **Уладзіслаў Макарэвіч** і **Валерыя Казлова**.

На лёдзе ўдзельнікі лядовага шоу змаглі паспрабаваць шчасця ў розыгрышы прызоў ад прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ: іміджавай прадукцыі, квіткоў на вялікі сольны канцэрт Алега Шчуцкага і партнёраў мерапрыемства – спартыўнага клуба «Татэм», вытворцы мясных снэкаў, дэлікатэсаў і паўфабрыкатаў «Вкусняшки от Сашки».

Гэтыя прызы сталі прыемным дадаткам да займальнага часу на катку.

Сваімі эмоцыямі і ўражаннямі падзяліся студэнты БДУ:

– студэнтка 4 курса Інстытута бізнесу **Дар'я Катлярова**: «Падобныя мерапрыемствы – выдатная магчымасць для студэнтаў добра правесці час, адпачыць ад вялікай навучальнай нагрузкі. Пацешыла колькасць выступленняў і насычаная праграма. Неверагодна прыгожымі былі нумары фігурыстаў, аж займала дух! Годна разагрэў публіку вядучы. Выдатная ідэя са снегавікамі і сцяганосцамі: Яны весялілі, заваблівалі ўсіх для фотаздымкаў. А якое цудоўнае было відэавіншаванне са святам ад студэнтаў з розных кропак свету! Абавязкова ўдзельнічайце ў наступным годзе!»

– студэнтка 2 курса ФФСН **Паліна Матвеева** дадала: «Класна, што арганізавалі такую імпрэзу ў гонар Дня студэнта, што дало магчымасць пазнаёміцца і пагутарыць са студэнтамі з іншых факультэтаў, а таксама сустрэць старых знаёмых. Лёд быў выдатны, канькі завостраны на «ўра». Дзякуй пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ, што растапіла лёд у нашых сэрцах!»

Пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ яшчэ раз віншуе ўсіх са святам! Хай гады ва ўніверсітэце будуць яркімі, насычанымі і незабыўнымі. І хай у сэрцы кожнага заўсёды будзе цяпло, якое зможа растапіць нават самы моцны лёд!

Прафкам студэнтаў БДУ
Фота Андрэя САБАЛЕВІЧА
і Васіля КУЗЬМІЧКІНА

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты –
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам
інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082
ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 06.12.2018 г.
Зак. 1369. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве
«БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123,
Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 719, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by